## Год родная зямлі на забруджаных тэрыторыях Гомельшчыны

Кожны год на Радаўніцу мой муж наведвае не толькі могілкі сваякоў, якія знаходзяцца ў забруджанай зоне Веткаўскага раёна, але і дом у вёсцы Вараб’ёўка, дзе нарадзілася яго маці. Кожны год усё менш застаецца ад цаглянай пабудовы, якая 23 гады таму выглядала зусім інакш, чым цяпер... Між іншым, на працягу дзесяці гадоў пасля аварыі дом стаяў зачынены і практычна нікім не крануты. А ў 1996 годзе, пасля таго, як разбурылася агароджа, дайшла чарга і да будынка. Спачатку невядомыя людзі знялі падлогу, потым — дах. Куды яно ўсё падзелася ў тыя гады — не ведае ніхто. Ну а потым падпалілі сцены і хлеў, які стаяў побач. Падворкаў, якія маюць прыкладна такі ж выгляд, як гэты, і па радыяцыйным фактары павінны быць знесены, на Гомельшчыне яшчэ каля 11 тысяч. І амаль трэцяя частка з іх — менавіта ў Веткаўскім раёне, які ўшчыльную прыбліжаны да абласнога цэнтра.

Год роднай зямлі — яшчэ адна афіцыйная падстава, каб навесці парадак у тым ліку ў такіх маленькіх куточках. Райцэнтры Гомельскай вобласці ўжо не нагадваюць аб падзеях 23-гадовай даўніны, а вось вёскі, якія знаходзяцца далей ад аўтамабільных трас, па-ранейшаму маюць непрыглядны выгляд, разбураюцца і ствараюць небяспеку ў глыбінцы.

— Аднак усе ранейшыя гады фінансаванне, якое выдаткоўвалася на гэтыя мэты па Чарнобыльскай праграме, не дазваляла нам выконваць работы такімі тэмпамі, як хацелася б, — распавядае начальнік аддзела радыяцыйнай аховы, аналізу і інфармавання ўпраўлення па праблемах ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Гомельскага аблвыканкама Галіна Акушка. — Знос разбураных пабудоў — толькі адна з самых надзённых праблем. Ведаеце, шмат населеных пунктаў, дзе людзі адсяліліся часткова. Побач стаяць адзін жылы дом і 3-4 закінутыя. Тут жа нельга рабіць так, як на чыстых тэрыторыях: прыгналі бульдозер і ўсё адразу знеслі. Работы тут выконваюцца з абавязковай праверкай адходаў на радыяцыйнае забруджванне. Тое, што з’яўляецца небяспечным, павінна быць захаванае ў спецыяльных "Пунктах захавання адыходаў і дэзактывацыі". Усё правяраецца па ступені небяспекі і сертыфікуецца. А прыдатным, напрыклад, бярвёнамі, распараджаюцца па ўсіх правілах мясцовыя органы ўлады.

— На Гомельшчыне толькі адно прадпрыемства РСУП "Палессе" спецыялізуецца на такіх работах, хіба яно справіцца з аб’ёмамі, якія патрэбна выканаць?

— Да гэтай работы мы прыцягваем субпадрадныя будаўнічыя арганізацыі. Але ж абавязкова павінна быць дазіметрычнае суправаджэнне з боку спецыялістаў РСУП "Палессе". Тым больш, даводзіцца разбіраць цэлы падворак, а гэта не толькі адзін дом, але і ўсе надворныя пабудовы. Раней мы захоўвалі не больш за 300-400 падворкаў у год, фінансаванне нам дазваляла, а цяпер трэба па ўсіх правілах знесці 11 тысяч! Атрымліваецца, мы павінны павялічыць больш чым у 4 разы колькасць таго, што зносілі раней. Вядома ж, за адзін год не атрымаецца выканаць такі вялізны аб’ём працы. Але ж ужо сёлета мы павялічылі аб’ёмы зносу і давядзём яго з 400 да 1200 — з дадатковым выдзяленнем фінансавых сродкаў. Ужо ў Веткаўскім раёне працуе на субпадрадзе арганізацыя, якая добра сябе зарэкамендавала, і думаем, калі мы будзем пераходзіць у іншыя раёны, у прыватнасці Хойніцкі, Чачэрскі, там таксама будзем шукаць субпадрадную арганізацыю, якая мае ліцэнзію на права выканання такіх работ і валодае неабходнай магутнай тэхнікай: бульдозерамі, экскаватарамі, самазваламі.

— Атрымліваецца, што найбліжэйшы да Гомеля раён — Веткаўскі — самы складаны ў сэнсе навядзення парадку...

— Так, тут больш за ўсё пабудоў, якія патрэбна зносіць. Мы практычна закончылі гэтыя работы ў Ельскім і Буда-Кашалёўскім раёнах. Працэнтаў на 70 прыбралі такія пабудовы на Брагіншчыне, прыступілі да работ у Хойніцкім, Чачэрскім і Кармянскім раёнах. Але ж там аб’ём меншы, чым на Веткаўшчыне, дзе каля 4 тысяч небяспечных пабудоў. Мы хацелі б, каб фінансаванне на гэта было павялічана. Мы робім усё, каб падрыхтаваць своечасова праектную дакументацыю на знос гэтых пабудоў, і шукаем субпадрадчыкаў для

выканання работ у раёнах. Прынамсі, хочуць узяць удзел у гэтай працы меліярацыйныя арганізацыі і служба МНС — у іх ёсць патрэбная тэхніка.

— Але ж пры навядзенні парадку знос "забруджаных" пабудоў — не адзіная праблема...

— Так, ёсць у сельскіх населеных пунктах, якія знаходзяцца на забруджаных тэрыторыях, яшчэ дзве вялікія бяды — вада і дарогі. Сеткі водазабеспячэння, якія былі пракладзены адразу пасля чарнобыльскай аварыі, яшчэ ў 86—90 гадах, прыйшлі ў такі стан, што іх патрэбна мяняць. І на гэтыя мэты патрабуюцца значныя сродкі. І на дарогі ў населеных пунктах — я маю на ўвазе вуліцы — у мясцовых органаў улады сродкаў не хапае. А яшчэ трэба працягваць работы па газіфікацыі дробных населеных пунктаў. Ёсць праграма па газіфікацыі, і гэтую працу трэба завяршыць — на гэты конт да нас людзі з месцаў часта звяртаюцца. Ёсць інструкцыя, у адпаведнасці з якой у населеных пунктах, дзе чалавек можа атрымаць дозу апраменьвання больш за адзін мілізіверт, газіфікацыя павінна праводзіцца бясплатна. У нас населеных пунктаў, якія падыходзяць пад гэтую катэгорыю, каля 600. Але ж пакуль у першачарговую праграму ўключаны толькі тыя, дзе больш за 100 двароў. Калі населены пункт невялікі, эканамічна нявыгадна цягнуць газавыя сеткі — гэта вельмі дарагое задавальненне.

— Ці змяняюцца з цягам часу падыходы да ахоўна-рэжымных тэрыторый?

— Змяняюцца. Падышлі мы да той рысы, калі трэба перагледзець жорсткія рамкі межаў: тут можна, напрыклад, сеяць, а тут нельга. Мы ўсё больш пачынаем абследаваць прылеглыя буферныя тэрыторыі да зонаў адсялення з мэтай вяртання іх у карыстанне: ці то сельскагаспадарчай, ці то лясной гаспадаркі. Ідзе карпатлівая, працаёмістая работа па выяўленні ўчасткаў, прыдатных да вяртання. І Буда-Кашалёва просіць частку земляў перадаць, і Карма...Між тым, механізм гэты дастаткова складаны. Рыхтуецца землеўпарадкавальная справа, потым дэпартамент звяртаецца ў Мінздраў для ацэнкі дозы выпраменьвання, Мінсельгасхарч для ацэнкі аграхімічных якасцяў глебы і магчымасці атрымання на ёй патрэбнага ўраджаю. Калі пад травастой — будзе адзін падыход, калі пад раллю — іншы. Кантралюючыя органы жорстка выкараняюць выпадкі, калі гаспадаркі займаюцца самазахопам зямлі. Яна можа перадавацца ў сельгаспрадпрыемствы толькі ў законным парадку.

***Гутарыла Ірына АСТАШКЕВІЧ.***

**Источник:** Звязда.-2009.-25 крас.-С.5.